

# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*А.А. МАКАРАВА*

## АМАТАРСКАЯ МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ БЕЛАРУСІ: СТАН І ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

Аматарская мастацкая творчасць была і застаецца адной з найбольш актыўных формаў мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Як кожная з’ява культуры, аматарскае мастацтва – вельмі мнагамерны, шматузроўневы сацыяльны арганізм. Рух аматарскай творчасці ў Беларусі мае даволі складаную дынаміку развіцця, пры наяўнасці агульных тэндэнцый стан розных відаў і жанраў аматарскай мастацкай творчасці ў рэгіянальным плане (гарадская і вясковая культура) неаднолькавы. На яго развіццё ўплывае сплаў гістарычных, этнарэгіянальных, эстэтычных, сацыяльна-псіхалагічных, эканамічных і іншых фактараў.

Як спецыяльна арганізаваная дзейнасць па засваенні, стварэнні і распаўсюджванні культурна-эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу аматарская мастацкая творчасць не губляе сваёй надзённасці і актуальнасці. Нягледзячы на існуючыя ў грамадстве сацыяльна-эканамічныя праблемы, ажыццяўленне істотных пераўтварэнняў у дзейнасці ўстаноў культуры і недахоп фінансавых сродкаў на іх утрыманне, “аматарскія мастацкія калектывы, як грамадска-культурныя аб’яднанні аматараў музычнага, харэаграфічнага, тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтва” [5, с. 7–11], карыстаюцца ўстойлівым попытам у насельніцтва і актыўна са- дзейнічаюць дачыненню да беларускай традыцыйнай і сусветнай мастацкай культуры значнай часткі грамадзян нашай краіны.

Вядомы культуролаг А.І.Смолік, разглядаючы аматарскую мастацкую творчасць з пазіцый тэорыі культуры, сцвярджае, што “яна з’яўляецца са- стаўной часткай духоўнай культуры грамадства, якая спрыяе яе ўзбагачэнню і дэмакратызацыі, а таксама фарміраванню сістэмы вытворчасці і распаўсюджванню эстэтычных каштоўнасцей” [6, с. 130–131]. Нельга не пагадзіцца з думкай, што “народная мастацкая творчасць – гэта найважнейшы пласт нацыянальнай культуры, яе аснова, без якой немагчымы фарміраванне нацыянальнай свядомасці і развіццё прафесійнага мастацтва”. Аналіз сацыякультурных працэсаў у сучаснай народнай мастацкай творчасці дае беларускім даследчыкам падставы для вываду, што “масавасць, уласцівая аматарскай творчасці, дазваляе ёй быць глебай мастацкага жыцця беларускага грамадства, носьбітам і паказчыкам яго патэнцыяльных магчымасцей у культурастваральнай дзейнасці” [7, с.91].

Даследаванні, праведзеныя ў розных рэгіёнах нашай краіны, пераконваюць, што аматарская мастацкая творчасць – сапраўды значная з’ява беларускай мастацкай культуры, своеасаблівы пласт народнай творчасці і адначасова адна з формаў праяўлення сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва ў сферы мастацтва. Як мастацкая калектыўная творчая дзейнасць народа, яна ўключае розныя віды і жанры аматарскай мастацкай дзейнасці, дзіцячую і сямейную мастацкую творчасць, студэнцкую самадзейнасць, мастацкую творчасць аматарскіх калектываў і асобных выканаўцаў, аматарскія мастацкія аб’яднанні і гурты па захапленнях і інш.

Практыка сведчыць, што аматарская творчасць у Беларусі – асаблівая і вельмі цікавая з’ява беларускай культуры. Яна адчула на сабе ўплывы сацыяльна-гістарычных падзей, якія перажываў беларускі народ на розных этапах сваёй гісторыі. З’яўляючыся працягам масавай аматарскай самадзейнасці савецкага часу, сучасная аматарская творчасць па-ранейшаму дэманструе уласцівыя нашаму народу таленавітасць і жыццялюбства.

У розных рэгіёнах краіны існуе значная колькасць такіх мастацкіх фарміраванняў, якія сваёй творчай працай уносяць значны ўклад у нацыянальную культурную скарбонку, садзейнічаюць фарміраванню нацыянальнай культуры праз прапаганду каштоўнасцей гэтай скарбонкі ўсімі даступнымі ёй формамі і метадамі.

Па асноўных напрамках вызначаюцца наступныя жанры аматарскай мастацкай творчасці: *тэатральны* (драматычны, музычны, лялечны тэатры, тэатры паэзіі, пантамімы, мініяцюр і інш.);

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

*вакальна-харавы* (хор, ансамбль з акадэмічнай, народнай і эстраднай манерай выканання і інш.); *харэаграфічны* (народны, класічны, бальны, эстрадны танец і інш.); *музычна-інструментальны* (аркестры, ансамблі народных інструментаў, духавой, эстраднай, джазавай музыкі і інш.); *дэкаратыўна-прыкладны і выяўленчы* (студыі жывапісу, лоза- і саломапляцення, керамікі, вышыўкі і ткацтва, фларыстыкі, апрацоўкі дрэва і скуры і інш.); *цыркавы, фота- , слайд- , кіна- , відэастудыі* і інш.

Аматарская творчасць характарызуецца жанравай разнастайнасцю як мастацкіх калектываў, так і аб'яднанняў аматараў мастацтва (клубы самадзейнай песні, класічнай музыкі, народнай песні, тэатра, жывапісу, джаз-клубы, клубы самадзейных кампазітараў і паэтаў, артклубы і інш.).

Узнаўляючы каштоўнасці традыцыйнай беларускай культуры ў сучасных сацыякультурных умовах, аматарская мастацкая творчасць выступае ў якасці самастойнай падсістэмы сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання і адукацыі. З’яўляецца актыўным сродкам самарэалізацыі творчых здольнасцей асобы, яе самапраяўлення і самавызначэння; выступае дзейсным механізмам эстэтычнага развіцця асобы, забяспечвае змястоўную арганізацыю вольнага часу аматараў мастацтва.

Дзейнасць аматарскіх калектываў рэгулюецца законам “Аб культуры ў Беларускай ССР”, Палажэннем аб самадзейным калектыве мастацкай творчасці Рэспублікі Беларусь, Палажэннем аб народным самадзейным калектыве мастацкай творчасці Рэспублікі Беларусь, у якіх вызначана сутнасць дзяржаўнай палітыкі ў галіне аматарскай мастацкай творчасці. Дзяржаўнае заканадаўства забяспечвае дастаткова высокую ступень свабоды культурна-творчай дзейнасці аматарскім калектывам, дае магчымасць новаўвядзенняў і сацыяльна-арганізацыйнага эксперыментавання ў галіне аматарскай творчасці, праяўлення творчай ініцыятывы, сапраўднай самадзейнасці насельніцтва.

Трэба падкрэсліць, што ў галіне аматарскай мастацкай творчасці ажыццяўляецца пэўная навукова-даследчая дзейнасць, прысвечаная праблемам бытавання самых розных відаў і жанраў аматарскай творчасці, яе ўнутрыжанравай праблематыкі, пытанням арганізацыі канцэртна-творчай дзейнасці, падрыхтоўкі кадраў і інфармацыйна-метадычнай падтрымкі аматарскай мастацкай творчасці, распрацоўкі фестывальных тэхналогій, рэпертуару і інш.

З мэтай падтрымкі і стымулявання аматарскай мастацкай творчасці, павышэння яе ўплыву на працэсы развіцця грамадскай актыўнасці насельніцтва ў сферы мастацтва, яе сацыяльнай ролі і ідэйна-мастацкага ўзроўню выканальніцкага майстэрства і далучэння да мастацка-эстэтычных каштоўнасцей розных груп насельніцтва ў Беларусі праводзяцца шматлікія святы, канцэрты, конкурсы, агляды і іншыя сацыяльна-культурныя акцыі. Пералічаныя формы арганізацыйна-творчай і навукова-метадычнай падтрымкі аматарскай творчасці з’яўляюцца найважнейшым кірункам дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання і дзейсным спосабам уплыву на працэсы яе развіцця**.**

Важным кірункам у стымуляванні і развіцці аматарскай творчасці з’яўляюцца міжнародныя, рэспубліканскія і рэгіянальныя фестывалі. Штогод іх праводзіцца каля 50, некаторыя з іх сталі ўжо традыцыйнымі: міжнародны фестываль аматарскай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы» ў Дуброўне, міжнародны фестываль юных талентаў «Зямля пад белымі крыламі», рэспубліканскі фестываль народнага танца “Беларуская полька”, харэаграфічнага мастацтва “Сожскі карагод”, тэатральнага «Тэатральныя скрыжаванні», народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны», фальклорнага мастацтва «Берагіня» і інш. Традыцыйным стаў Усебеларускі фестываль нацыянальных культур, у якім прымаюць удзел лепшыя мастацкія калектывы і выканаўцы самых розных жанраў аматарскай творчасці. Важным творчым стымулам для аматарскіх мастацкіх калектываў і эфектыўнай формай прапаганды беларускага мастацтва сталі таксама традыцыйныя фестывалі, якія з’яўляюцца сапраўднай візітоўкай культуры Беларусі: “Славянскі базар у Віцебску”, “Залаты шлягер”.

Галоўным аглядам стану аматарскай мастатцкай творчасці краіны з’яўляецца фестываль народнага мастацтва “Беларусь – мая песня”(1997–1998, 2004–2005 гг.).

Працэс фарміравання фестывальных традыцый аматарскай мастацкай творчасці ідзе актыўна як на рэспубліканскім, так і мясцовым узроўнях. Традыцыйнымі ў Мінскай вобласці сталі фестывалі духавой музыкі «Майскі вальс», народнай музыкі «Іграй, гарамонік!», харавога мастацтва «Пеўчае поле», дзіцячай тэатральнай творчасці «Чароўны куфэрак». У Магілёўскай вобласці традыцыйна праводзіцца конкурс ваенна-патрыятычнай і маладзёжнай песні памяці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л.Лорчанкі; у Брэсцкай вобласці – фестывалі эстраднага мастацтва «Рытмы маладосці», тэатральнай творчасці «Тэатральнае Палессе», рэгіянальнага танца «Палескі карагод» і інш. Сістэматычна ў Гродзенскай вобласці праходзяць фестывалі сямейнай творчасці, бардаўскай песні, свята танца, фестывалі беларуска-польскага сяброўства.У Віцебскай і Гомельскай абласцях таксама праводзіцца значная колькасць фестывальных мерапрыем- стваў.

Адным з найбольш эфектыўных спосабаў уплыву на развіццё аматарскай мастацкай творчасці з'яўляецца прысваенне ганаровага звання «Народны (узорны) самадзейны калектыў мастацкай творчасці». Гэта своеасабливая форма праяўлення грамадскага прызнання значнасці ўкладу аматарскага калектыву ў развіццё мастацкай культуры і культурнае абслугоўванне насельніцтва. Аб высокім узроўні развіцця аматарскай мастацкай творчасці сведчыць колькасць "народных" і "ўзорных" калектываў, што працуюць пад "дахам" устаноў культуры розных ведамстваў. Па рэспубліцы іх налічваецца больш за 1600. У дзяржаўных клубных установах працуюць 936 «узорных» і «народных» аматарскіх калектываў, 260 мастацкіх калектываў сістэмы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і 230 аматарскіх фарміраванняў сістэмы Міністэрства адукацыі таксама маюць гэтыя ганаровыя званні (даныя на канец 2004 г.).

Толькі ў горадзе Мінску функцыянуюць каля 4500 калектываў мастацкай творчасці, з іх 220 фарміраванняў розных жанраў і кірункаў дзейнасці маюць ганаровыя званні "народны" і "ўзорны"( даныя на канец 2004 г.).

Як з'ява беларускай нацыянальнай культуры, сучасная аматарская мастацкая творчасць праз зварот да этнарэгіянальных традыцый і звычаяў беларускага і іншых народаў Беларусі набывае новы якасны ўзровень і эстэтычную значнасць.

Разам з тым у сваім развіцці аматарская мастацкая творчасць пастаянна абапіраецца на здабыткі акадэмічных відаў і жанраў мастацтва; самыя разна- стайныя мастацкія стылі і гістарычныя эпохі знаходзяць сваё ўвасабленне ў практыцы функцыянавання аматарскіх калектываў. Пад уздзеяннем сродкаў масавай інфармацыі, у першую чаргу тэлебачання, усё большае развіццё атрымліваюць віды аматарскай дзейнасці, звязаныя з сучаснай тэхнікай, камп'ютэрам (рок-музыка, дыскаклубы, камп'ютэрная графіка); адчуваецца значны ўплыў на аматарскую творчасць з боку сучаснага шоу-бізнесу і індустрыі музычных забаў.

Калектывы аматарскай мастацкай творчасці даволі актыўна ажыццяўляюць сёння сваю дзейнасць на базе дзяржаўных, прафсаюзных, ведамасных устаноў культуры, вышэйшых, сярэдніх спецыяльных, сярэдніх навучальных устаноў, устаноў пазашкольнай адукацыі і выхавання, вайсковых часцей, прадпрыемстаў розных формаў уласнасці, грамадскіх аб'яднанняў, творчых саюзаў і інш.

Пазітыўныя зрухі, што можна назіраць у апошнія гады ў аматарскай творчасці, непасрэдна звязаны з актывізацыяй канцэртнай дзейнасці ў рэгіёнах. Увогуле, культурнае жыццё рэгіёнаў Беларусі сёння ў значнай ступені вызначаецца культурна-творчай і канцэртна-відовішчнай дзейнасцю, якую ажыццяўляюць менавіта калектывы аматарскай мастацкай творчасці.

Значная колькасць калектываў мастацкай самадзейнасці належыць установам культуры клубнага тыпу розных ведамстваў (4700), у першую чаргу дзяржаўным клубным установам (4260), якія з'яўляюцца сапраўднымі цэнтрамі развіцця аматарскай творчасці і сацыяльна-культурных ініцыятыў, надаюць арганізаваны характар розным відам і формам мастацкай дзейнасці насельніцтва беларускай правінцыі [8, с.61].

Для падтрымкі найбольш самабытных і яркіх у мастацкіх адносінах аматарскіх калектываў, якія спрыяюць развіццю аматарскай творчасці, далучэнню насельніцтва да каштоўнасцей мастацкай культуры і ўяўляюць сабой мастацкую каштоўнасць для краіны, уведзена званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь» (Пастанова Савета Міністраў і Палажэнне аб парадку надання гэтага звання былі прыняты 2 лістапада 2001 г.).

За творчыя дасягненні, высокае выканальніцкае майстэрства, актыўную канцэртна-гастрольную дзейнасць, уклад у развіццё і папулярызацыю нацыяльнальнага мастацтва званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" прысвоена народнаму ансамблю танца "Радасць" Брэсцкага гарадскога Дома культуры; народнаму вакальна-харэаграфічнаму ансамблю "Гомій" Гомельскага гародскога цэнтра культуры; народнаму фальклорнаму гурту "Журавінка" Слабадскога сельскага Дома культуры Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці; народнаму фальклорнаму ансамблю "Крупіцкія музыкі" Крупіцкага цэнтра культуры Мінскага раёна; народнаму ансамблю беларускай песні "Церніца" Мінскага Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў; народнаму фальклорнаму ансамблю "Паазерье" выкладчыкаў Пастаўскай дзіцячай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычнай школы Віцебскай вобласці; народнаму ансаблю беларускай песні “Медуніца” Палаца культуры і тэхнікі рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства “Хімвалакно”; народнай харавой капэле Рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў; народнаму ансамблю народнай музыкі “Выцінанка” Столінскага гарадскога Дома культуры; сімфанічнаму аркестру Маладзечанскага музычнага вучылішча імя М.К.Агінскага; ансамблю танца “Равеснік” Рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў і інш.

Даследаванні, праведзеныя намі ў складзе навукова-творчай групы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ў розных абласцях і этнарэгіёнах Беларусі на працягу 1993–2003 гг., дазваляюць вызначыць асноўныя тэндэнцыі развіцця аматарскай мастацкай творчасці:

– пэўная стабілізацыя аўдыторыі мастацкай аматарскай творчасці;

– адносна пастаянная на працягу апошніх дзесяці годоў агульная колькасць прыхільнікаў (наведвальнікаў) канцэртна-відовішчных праграм аматарскіх калектываў;

– актуалізацыя патрэбнасці насельніцтва рэгіёнаў краіны ў кантактах з мастацтвам праз аматарскую мастацкую творчасць;

– рост эфектыўнасці ўплыву аматарскай творчасці на сацыякультурнае жыццё рэгіёнаў краіны;

– актывізацыя грамадскіх інтарэсаў да відаў аматарскай творчасці, заснаваных на гістарычна-культурных традыцыях;

– зварот да вытокаў нацыянальнай культуры і адраджэнне ў сучасным культурным жыцці традыцыйных узораў аматарскай творчасці;

– актывізацыя дзейнасці мастацкіх калектываў, створаных пры нацыянальна-культурных аб’яднаннях;

– стварэнне раённых філарманічных арганізацый на базе існуючых клубных структур у Слуцку, Маладзечне, Стоўбцах, Глыбокім і інш.;

– падтрымка нормаў канцэртна-філарманічнага жыцця ў раёнах, жанравай разнастайнасці мастацкіх аб'яднанняў, іх імкнення да высокага ўзроўню выканаўчага майстэрства;

– устойлівая тэндэнцыя развіцця асобных жанраў аматарскай творчасці з апорай на здабыткі акадэмічных відаў і жанраў мастацтва;

– узрастанне ролі індывідуальнага фактара пры выбары відаў аматарскай дзейнасці, формаў арганізацыі вольнага часу, зместу яго запаўнення; устаноўка на самапраяўленне і самавызначэнне, пры гэтым не столькі на сумесную калектыўную творчасць, колькі на асабісты кантакт з мастацтвам праз аматарства: выяўленчае мастацтва, народныя промыслы, дызайн, бардаўскую песню, сольныя эстрадныя спевы;

– пашырэнне працэсу стандартызацыі і тыражавання тыповых відаў і формаў аматарскай дзейнасці, мадэлей сацыяльна-культурнай актыўнасці ў сферы мастацкай творчасці; значны ўплыў на аматарскую творчасць з боку сучаснага шоу-бізнесу і індустрыі музычых забаў.

– актыўны працэс фарміравання фестывальных традыцый аматарскай мастацкай творчасці як на рэспубліканскім, так і мясцовым узроўнях;

– рэгіяналізацыя як адна з найбольш відавочных тэндэнцый аматарскай дзейнасці; пры наяўнасці агульных тэндэнцый у аматарскай мастацкай творчасці развіццё яе розных відаў і жанраў у рэгіянальным плане адбываецца неаднолькава;

– канцэртна-творчая дзейнасць аматарскіх мастацкіх аб'яднанняў дазваляе ў некаторай ступені вырашаць пытанні самафінансавання ўстаноў культуры;

– сучасныя формы мастацка-творчай актыўнасці моладзі (поп-, рок-музыка, джаз, бардаўская песня, дызайн і інш.) пакуль што не знаходзяць да- статковага развіцця ў межах клубнай практыкі [3, 4].

Вяртанне да культурна-гістарычных традыцый – адзін з найбольш актыўных сацыяльна-культурных працэсаў, што адбываецца зараз у аматарскай творчасці паўсюдна ў рэгіёнах Беларусі. У працэсе гістарычнага развіцця “беларускі этнас набыў свае асаблівасці, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне і існуюць у такіх адносна ўстойлівых формах, як мова, традыцыі, абрады, народная творчасць, этнічная самасвядомасць, тапаніміка, культура, лад паўсядзённага жыцця і г.д.” [1]. Звяртаючы увагу на ўзнаўленне фальклорных традыцый у аматарскай творчасці, неабходна падкрэсліць, што аўтэнтычны фальклор, як “першасны від традыцыйнай мастацкай культуры ў яго спрадвечным выглядзе існуе ў натуральным вясковым асяроддзі, мае старажытныя карані, перадаецца з пакалення ў пакаленне вусным шляхам, выяўляецца праз носьбітаў фальклору (спевакоў, музыкаў, танцораў, казачнікаў, майстроў, знаўцаў мясцовай традыцыі і звычаяў)” [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасны перыяд жыцця нашага грамадства, які характарызуецца складаным сацыяльна-эканамічным становішчам, роля дзяржавы як гаранта культурнай палітыкі значна ўзрастае. Безумоўна, такой складанай і шматузроўневай сістэме, якой з'яўляецца сучасная аматарская творчасць у Беларусі, нельга навязваць шляхі развіцця з боку дзяржаўных органаў кіравання, не абапіраючыся на ўласныя законы кожнай з яе падсістэм. Трэба садзейнічаць унутраным тэндэнцыям развіцця гэтай сістэмы, вызначаючы пры гэтым змены ў характары кіравання культурнымі працэсамі на аснове іх выбарачнага эканамічнага стымулявання і забяспечваючы неабходнай заканадаўча-прававой абаронай.

Зразумела, што культурная палітыка ў галіне аматарскай мастацкай творчасці павінна абапірацца на навукова абгрунтаваныя вывады. Між тым апошнія даследаванні ў галіне аматарскай творчасці ў Беларусі дазваляюць канстатаваць, што практыка развіцця аматарскай мастацкай творчасці пайшла далёка наперад ад яе навукова-тэарэтычнага асэнсавання [8, 9]. Становішча з навукова-тэарэтычнай распрацоўкай праблем аматарскага мастацтва ў нашай краіне застаецца складаным, адчуваецца недахоп інтэлектуальнага забеспячэння сучасных працэсаў і пераўтварэнняў у галіне аматарскай творчасці і сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Спецыялісты галіны аматарскай творчасці, работнікі культуры ў рэгіёнах не атрымліваюць неабходнай навуковай і іншай падтрымкі сваёй дзейнасці, што вядзе да значных і часам небяспечных хібаў у практыцы кіравання мастацка-творчай дзейнасцю аматарскіх калектываў, да зніжэння сацыяльнай эфектыўнасці культурна-творчай работы з насельніцтвам.

Патрабуецца больш разгорнутае навукова-тэарэтычнае асэнсаванне тых з'яў, што адбываюцца ў аматарскай мастацкай творчасці ў розных рэгіёнах краіны. Неабходна правядзенне спецыяльных сацыялагічных даследаванняў, прысвечаных праблемам бытавання самых розных відаў і жанраў аматарскай творчасці. Трэба пашыраць кола навуковых тэм і даследаванняў, прысвечаных сацыякультурнаму жыццю розных рэгіёнаў краіны і выяўленню дынамікі развіцця аматарскай мастацкай творчасці, якая актыўна спрыяе развіццю мастацка-эстэтычнай дзейнасці насельніцтва, росту культурнага набытку нацыі, забяспечвае захаванне культурнай спадчыны народа, садзейнічае рэгуляцыі сацыяльна-культурных працэсаў у рэгіёнах Беларусі. Для гэтага неабходна прыцягненне шырокага кола спецыялістаў з ліку культуролагаў, мастацтва- знаўцаў, сацыёлагаў, эканамістаў і інш.

---

1. *Варфаламеева Г.Б.* Гэты яўны патаемны свет фальклору // Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы.—Мн.: БелІПК, 1997. – С. 38–43.

2. *Даведнік* калектываў аматарскай творчасці Рэспублікі Беларусь, якія маюць званні “народны” і “узорны” / Уклад. А.А.Скарына і інш. – Мн.: БелІПК, 1998. – 122 с.

3. *Макарава А., Сівурава Л.* Аб шляхах фарміравання фестывальных традыцый ў самадзейнай мастацкай творчасці// Веснік БелІПК: Навук.-метад. зб. – Мн.: БелІПК, 1999. – С.107. – 112.

4. *Макарава А.А.* Сацыяльна-культурныя пераўтварэнні ў дзейнасці сучасных клубных устаноў // Інфармацыйныя матэрыялы да рэспубліканскага семінара «Новыя падыходы да праблем сельскай культуры» (Мінск, 14– 15 снеж. 2000 г.). – Мн.: БелІПК, 2001. – С.29– 51.

5. *Палажэнне* аб самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь //Нарматыўна-прававыя дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці/ Уклад.Т.І.Стружэцкі. – Мн.: БелІПК, 1999. – Вып.4. – С.7– 11.

6. *Смолік А.І.* Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме: Вучэб. дапам. для вышэйш. і сярэд. спец. навуч. устаноў. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. – С.130– 131.

7. *Скараходаў У.П., Пыж І.В.* Сацыякультурныя працэсы ў народнай мастацкай творчасці // Беларуская культура сёння: Гадавы агляд / Навук. рэд. У.П.Скараходаў. – Мн.: БелДІПК, 2003. – С.91–104.

8. *Статыстычны* партрэт культуры Беларусі: Агляд тэатр.-відовішч. і культ–асвет. устаноў сістэмы М–ва культуры РБ / БелДІПК. – Мн., 2003. – С. 66–68.

9. *Палажэнне* аб народным (узорным) самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь //Нарматыўна–прававыя дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці/ Уклад.Т.І. Стружэцкі. – Мн.: БелІПК, 1999. – Вып.4. – С.14–17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ